ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (2016) ● Чацвер, 29 студзеня 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ ● АБ'ЯЎЛЕН МЕСЯЧНІК ● ПАВЫШАЦЬ ПАТРАБАВАННІ ● СЁННЯ СЛОВА ТАБЕ — ЗАВОЧНІК! ● ЛЮТАЎСКІ КАЛЯНДАР ● СПОРТ ● СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ ● ЛІСТОК ДАІ ● ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ.



## АБ'ЯЎЛЕН МЕСЯЧНІК

**23 лютага 1976 года ўвесь савецкі народ у 58-ы раз адзначыць дзень стварэння У. І. Леніным і Камуністычнай партыяй Узброеных Сіл СССР. У гонар гэтай даты пастановай сакратарыята ВЦСПС, сакратарыята ЦК ВЛКСМ і бюро прэзідыума ЦК ДТСААФ з 23 студзеня па 23 лютага (у ВНУ да 1 сакавіка) праводзіцца месячнік.**

**Задачы месячніка — далейшае ўмацаванне сувязей прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый і арганізацый ДТСААФ з воінскімі часцямі і караблямі; узмацненне ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў і супрацоўнікаў, выхаванне ў іх любві да сацыялістычнай Радзімы, Камуністычнай партыі, гордасці за вялікія здзяйсненні савецкага народа, павагі да слаўных Узброеных Сіл і пастаяннай гатоўнасці стаць на абарону сацыялістычнай Айчыны.**

**У час месячніка мяркуецца расшырыць работу сярод студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ па авалоданню імі ваенна-тэхнічнымі спецыяльнасцямі, па павелічэнню колькасці спартсменаў-разраднікаў па ваенна-прыкладных відах спорту і значкістаў ГПА. Намечана таксама расшырыць матэрыяльную базу для правядзення абаронна-масавай работы, аформіць наглядную агітацыю па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. За перыяд месячніка арганізацыя ДТСААФ павялічыць свае рады.**

**У кожнай арганізацыі намечана прачытаць у час месячніка дзве-тры лекцыі і даклады на ваенна-патрыятычныя тэмы, арганізаваць адзін-два паходы па месцах баявой, рэвалюцыйнай і працоўнай славы, сустрэчы студэнтаў і супрацоўнікаў з Героямі Савецкага Саюза, ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, былымі партызанамі, воінамі Савецкай Арміі. Адбудуцца экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на Курган Славы, у Хатынь і іншыя памятныя месцы.**

**За перыяд месячніка адбудуцца спаборніцтвы па кулявой стральбе (сярод студэнтаў і супрацоўнікаў), радыёспорту (на першынство факультэта і першынство БДУ).**

**Запрашаем усіх студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў прыняць актыўны ўдзел у правядзенні месячніка.**

**М. ГАРЛАТАЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ БДУ.**

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

На факультэце прыкладной матэматыкі нядаўна адбылося сумеснае пасяджэнне бюро камітэта камсамола з кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, на якім абмяркоўваліся пытанні павышэння паспяховасці па грамадскіх дысцыплінах, вялася гутарка аб навуковай працы студэнтаў, аб якасці заняткаў, семінараў і лекцый.

* * *

На ўсіх факультэтах прайшлі паседжанні вучэбна-метадычных камісій па пытаннях здачы заліковай сесіі. Камітэт камсамола ўдзяляе ўвагу розным сесійным пытанням. Так, адзначана, што амаль усе факультэты вывесілі экраны паспяховасці, дзе фіксуюцца адзнакі кожнага студэнта па здадзенай дысцыпліне. Наладжаны выпуск баявога лістка — «Маланкі», які павінен рэагаваць на ўсе выпадкі непаспяховасці ў час сесіі, крытыкаваць нядобрасумленны падыход некаторых студэнтаў да здачы залікаў і экзаменаў

* * *

Камітэтам камсамола падведзены вынікі на лепшую акадэмічную групу універсітэта. Першымі з'яўляюцца: 17 група IV курса фізфака, 1 група III курса біяфака, 4 група IV курса ФПМ.

## ПАВЫШАЦЬ ПАТРАБАВАННІ

### ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА

Важнай састаўной часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу з'яўляецца грамадска-палітычная практыка. Гэта зразумела, таму што жыццё, практыка камуністычнага будаўніцтва патрабуюць ад выпускнікоў універсітэта не толькі прафесіянальнай падрыхтоўкі, але і цэлага комплексу ведаў, навыкаў арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы ў калектыве. Грамадска - палітычная практыка і прадугледжвае цэлую сістэму мерапрыемстваў, накіраваных на набыццё студэнтам навыкаў гэтай работы.

Сістэма грамадска-палітычнай практыкі ўключае:

— чытанне спецыяльнага тэарэтычнага курса і правядзенне практычных заняткаў;

— пазавучэбныя заняткі на факультэтах грамадскіх прафесій, у школах маладога лектара; выкананне практычнай, арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы;

— атэстацыю кожнага студэнта адзін раз у год.

У нашым універсітэце для кіраўніцтва грамадска-палітычнай практыкай арганізаваны агульнауніверсітэцкі савет, а таксама саветы або камісіі на факультэтах. Яны распрацоўваюць заданні па практыцы, мерапрыемствы па яе ўдасканаленню, здзяйсняюць кантроль.

Ва універсітэце вядзецца шматгранная работа па павышэнню эфектыўнасці работы факультэта грамадскіх прафесій і школы маладога лектара, арганізоўваюцца студэнцкія агітбрыгады, якія вядуць значную прапагандысцкую работу на прадпрыемствах, будоўлях, у саўгасах і калгасах. Кафедры грамадскіх навук, дэканаты, партыйныя і камсамольскія арганізацыі прыцягваюць студэнтаў да актыўнага ўдзелу ва універсітэцкіх, рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх работ. Так, у V Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаным 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, прынялі ўдзел 2.033 студэнты БДУ. Усяго навуковай работай займаюцца 73 працэнты студэнтаў стацыянара.

Важным у арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычнай практыкі з'яўляецца актыўны ўдзел студэнтаў у розных формах грамадска-палітычнай работы ў перыяд педагагічнай і вытворчай практык. У гэтым навучальным годзе кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў распрацавала план мерапрыемстваў па кіраўніцтву грамадска-палітычнай практыкай студэнтаў V курса фізфака ў перыяд іх вытворчай практыкі. Гэты план быў адобраны метадычнай камісіяй факультэта і паспяхова здзяйсняецца. Такія ж планы ёсць і на іншых факультэтах.

Многае зроблена па ўдасканаленню грамадска-палітычнай практыкі і на гістарычным факультэце. У мінулым навучальным годзе тут распрацаваны атэстат па грамадска-палітычнай практыцы для кожнага студэнта. У атэстаце фіксіруецца праробленая грамадская работа за ўвесь перыяд навучання, даецца характарыстыка студэнта за кожны курс.

Пытанні арганізацыі і правядзення грамадска-палітычнай практыкі пастаянна разглядаюцца на рэктараце, саветах факультэтаў, на партыйных і камсамольскіх сходах. Так, на партыйным сходзе геафака ў канцы мінулага навучальнага года абмяркоўваліся пытанні практыкі, а ў лістападзе гэтага года партыйны сход праверыў выкананне намечаных мерапрыемстваў. Разам з тым у арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў ёсць яшчэ і недахопы. Не распрацаваны і не чытаюцца тэарэтычныя курсы па асновах арганізатарскай і выхаваўчай работы ў працоўным калектыве.

У праграму вучэбных заняткаў па грамадска-палітычнай практыцы павінна ўваходзіць:

— на I курсе — засваенне курса «Развіццё адукацыі ў СССР і задачы падрыхтоўкі спецыялістаў на сучасным этапе», напісанне рэферата па гісторыі КПСС;

— на II курсе — засваенне другога раздзела тэарэтычнага курса «Ленінскія прынцыпы агітацыйна-масавай работы», працяг работы над рэфератам;

— на III курсе — засваенне трэцяга раздзела тэарэтычнага курса «Ленінскія прынцыпы прапагандысцкай работы»;

— на IV курсе — засваенне чацвёртага раздзела тэарэтычнага курса «Асновы арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы ў працоўным калектыве», выступленні студэнтаў у навуковых гуртках, на канферэнцыях, прадпрыемствах;

— на V курсе — абавязковае для кожнага студэнта выступленне па тэматыцы кафедр грамадскіх або спецыяльных навук у час вытворчай або педагагічнай практык.

Нярэдка даводзіцца чуць выказванні, што студэнтам няма дзе выступаць з падрыхтаванымі рэфератамі, дакладамі, інфармацыямі. У якасці базавых прадпрыемстваў для грамадска-палітычнай практыкі неабходна выкарыстаць школы, тэхнікумы, ПТВ, заводы, фабрыкі, калгасы і саўгасы.

Неабходна адзначыць, што кафедры грамадскіх навук яшчэ не праяўляюць належнай актыўнасці ў арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычнай практыкі. Не ўсе выкладчыкі гэтых кафедр удзельнічаюць у практыцы. Рад кафедр не распрацавалі тэматыку лекцый і рэфератаў па грамадска-палітычнай практыцы, не аказваюць студэнтам дапамогі ў выбары тэм.

Сур'ёзным недахопам з'яўляецца і адсутнасць адзінай сістэмы ацэнкі практыкі ва універсітэце. Некаторы вопыт такой работы ёсць на гістфаку. Там уведзены атэстат для кожнага студэнта, распрацавана бальная сістэма ацэнкі розных відаў практыкі.

Неабходна пераняць вопыт і ў іншых ВНУ БССР.

У цяперашні час нам неабходна скіраваць намаганні на ліквідацыю адзначаных недахопаў, правесці работу па далейшаму ўдасканаленню грамадска-палітычнай практыкі.

**У. БАГДАНАЎ,**
**старшыня савета па арганізацыі і кантролю за правядзеннем грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў БДУ.**

# СЁННЯ СЛОВА

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧУЮ РАБОТУ — НА НОВУЮ СТУПЕНЬ!

Разам з усёй краінай наш універсітэт сустракае XXV з'езд КПСС у абстаноўцы вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму. Завочны факультэт таксама актыўна ўключыўся ў работу па выкананню рашэнняў партыі і ўрада, накіраваных на паляпшэнне і далейшае ўдасканаленне вышэйшай адукацыі ў краіне.

У Праграме КПСС гаворыцца, што прагрэс навукі і тэхнікі ва ўмовах сацыялістычнай сістэмы дазваляе найбольш эфектыўна выкарыстаць багацці прыроды ў інтарэсах народа, а прымяненне навукі становіцца рашаючым фактарам магутнага росту прадукцыйных сіл грамадства.

Удзельнічаючы ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, за паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана, калектыў завочнага факультэта адным з асноўных напрамкаў сваёй дзейнасці лічыць павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, атрымліваючых вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці. А гэта, як вядома, немагчыма без прыцягнення студэнтаў да навукова-даследчай работы.

Вядома, умовы навуковай работы ў завочнай сістэме навучання маюць дадатковыя цяжкасці ў параўнанні з навукова-даследчай работай студэнтаў дзённага і вячэрняга аддзяленняў, таму што абмежаваны бюджэт часу, а таксама абмежаваныя магчымасці непасрэдных зносін з навуковым кіраўніком у многім ускладняюць такую работу. Але тым не менш няма ніякіх падстаў ад яе адмаўляцца. Як паказвае вопыт работы нашага факультэта, у радзе выпадкаў студэнты-завочнікі маюць і свае перавагі: спалучэнне вучобы і практычнай работы. Нярэдка вялікі вытворчы або педагагічны вопыт студэнта-завочніка аказваецца добрай і даволі трывалай асновай для правядзення навуковага эксперыменту, тэарэтычнага абагульнення.

У нашым універсітэце даўно склаліся трывалыя традыцыі навукова-даследчай работы студэнтаў-завочнікаў.

Сёння мы можам назваць нямала імён буйных беларускіх вучоных, выкладчыкаў ВНУ, якія пачыналі свае першыя навуковыя вопыты іменна на завочным факультэце БДУ. Сярод іх член-карэспандэнт АН БССР, дырэктар інстытута літаратуры АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар І. Я. Навуменка, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі БДУ, прафесар Я. А. Іваноў, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі хіміка-тэхналагічнага інстытута, дацэнт В. І. Старавойтаў, намеснік дэкана біяфака БДУ, дацэнт А. С. Шуканаў. Толькі на геаграфічным факультэце нашага універсітэта працуюць чатыры кандыдаты навук і тры старшыя выкладчыкі — былыя студэнты-завочнікі.

Формы кіраўніцтва навукова-даследчай работай студэнтаў-завочнікаў не могуць поўнасцю супадаць з формамі навуковага кіраўніцтва на стацыянары. Поспех у арганізацыі навуковай работы завочнікаў у першую чаргу вызначаецца тым, наколькі інтэнсіўна ў гэтым напрамку вядзецца работа на кафедрах.

Вынікі навукова-даследчай работы студэнтаў-завочнікаў за апошнія тры гады дазваляюць гаварыць аб тым, што рад кафедр адносяцца да арганізацыі навукова-даследчай работы з завочнікамі з неабходнай увагай—сістэматычна займаюцца рашэннем пытанняў, звязаных з арганізацыяй і методыкай вучэбнага працэсу ў цэлым, творча падыходзяць да абмеркавання тэматыкі пісьмовых работ, да арганізацыі і правядзення вытворчай і пераддыпломнай практык.

У першую чаргу неабходна адзначыць плённую работу кафедр геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў. Штогод на рэспубліканскі агляд студэнцкіх навуковых работ прадстаўляюцца і работы студэнтаў-завочнікаў, падрыхтаваныя на гэтых кафедрах.

Нядрэнных паказчыкаў дабіліся і кафедры грамадскіх навук, павялічылася колькасць навукова-даследчых работ студэнтаў аддзяленняў журналістыкі і беларускай мовы і літаратуры.

У 1973 годзе на рэспубліканскі агляд па завочнаму факультэту было прадстаўлена 36 работ, а ў 1974—33. Ні адна з гэтых работ не была адхілена і большасць атрымала вышэйшую адзнаку (аднесены да першай катэгорыі), многія з іх былі рэкамендаваны да друку. Сем работ (5—у 1973 годзе, 2—у 1974 годзе) атрымалі заахвочвальныя прэміі на Усесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ.

Аднак нельга не сказаць, што большасць кафедр пытанні навукова-даследчай работы студэнтаў-завочнікаў не толькі не падвяргаюць сур'ёзнаму метадычнаму аналізу, але і не ўключаюць у план сваёй работы. Так, напрыклад, па аддзяленню правазнаўства, самаму вялікаму па колькасці студэнтаў, за 1973 год у навукова-даследчай рабоце прыняло ўдзел усяго два, а ў 1974 годзе — тры студэнты.

Не прадстаўлена ніводнай работы за апошнія два гады па кафедры педагогікі, у той час як многія студэнты-завочнікі, што працуюць у школах, маюць вялікі стаж педагагічнай дзейнасці, іх дыпломныя работы, як правіла, атрымліваюць высокія адзнакі і рэкамендуюцца ў якасці дапаможнікаў.

Можна ўказаць некалькі пытанняў, на якія яшчэ звяртаюць недастаткова ўвагі кіраўнікі кафедр і выкладчыкі і якія неабходна вырашыць для далейшага паспяховага развіцця навукова-даследчай работы студэнтаў-завочнікаў. Адным з такіх пытанняў з'яўляецца курсавая работа і яе рэцэнзіраванне. Іменна курсавая работа — адна з пачатковых форм навуковай работы студэнта. У час яе напісання ён упершыню сутыкаецца з неабходнасцю самастойна правесці эксперымент, сабраць неабходны фактычны матэрыял, абагульніць яго.

У першую чаргу кафедра павінна з вялікай адказнасцю аднесціся да вызначэння тэматыкі курсавых работ, не дапускаючы фармальнага падыходу да яе зацвярджэння, строга ўлічваючы розныя ступені складанасці для студэнтаў малодшых і старэйшых курсаў.

Паспяховае выкананне курсавой работы, яе якасць у многім залежаць ад навуковага кіраўніка. На яго, па сутнасці, ускладаецца адказнасць за курсавую работу, таму што іменна ён не толькі ацэньвае работу ў цэлым, але і адзначае ўсё тое каштоўнае, што зроблена студэнтам, указвае на тое новае, што дасягнута пачынаючым даследчыкам.

У адпаведнасці з новай інструкцыяй па рэцэнзіраванню кантрольных і курсавых работ студэнтаў-завочнікаў, зацверджанай Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у верасні 1975 года, завяршаючым этапам у напісанні курсавой работы стане яе абарона на кафедры. Гэта дасць магчымасць навуковым кіраўнікам глыбей азнаёміцца з асноўнымі палажэннямі студэнцкага даследавання, лепш даведацца пра здольнасці і схільнасці выканаўцы работы, дапаможа больш дакладна вызначыць далейшыя напрамкі даследавання і садзейнічаць далейшаму павышэнню навукова-даследчай работы студэнтаў-завочнікаў у цэлым.

**Н. МАЖЭЙКА,**
**дэкан завочнага факультэта.**



*У студэнтаў-завочнікаў зараз гарачая пара — сесія. Многа новых неадкладных спраў у сувязі з гэтым паявілася ў дэкана завочнага факультэта Н. С. Мажэйкі і яе намесніка У. А. Царука.*

*Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.*

## ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПРАКТЫКІ

Начная прахалода знікае ад яркіх ранішніх праменняў майскага сонца. Яно ўстала рана, раней, чым мы. Лагер яшчэ спіць. Учора быў цяжкі дзень: прыезд, уладкаванне, знаёмства з мясцовасцю. Студэнты-завочнікі прыбылі на палявую практыку па геадэзіі, метэаралогіі і кліматалогіі, глебазнаўству, геамарфалогіі, ландшафтазнаўству.

Лёгкі вецярок іграе вяршынямі маладых сасёнак, блішчыць расой луг, спяваюць птушкі. Тут, ля падножжа прыгожага ўзгорка, на беразе Заходняй Беразіны размясцілася наша станцыя.

Сем гадзін. Рэзкі гук трывожыць ранішнюю цішыню, будзіць лагер.

— Пад'ём!

Пасля снедання старасты запрашаюць усіх на лінейку. Студэнты другога, трэцяга і чацвёртага курсаў пастроены.

Дзевяць гадзін раніцы. Кіраўнікі практыкі тлумачаць студэнтам мэты і задачы практыкі, знаёмяць з парадкам работ, рэжымам дня. Назначаюцца нарады на кухню, на ўпарадкаванне станцыі. Лінейка закончана, брыгады бяруць прылады, інструменты і разыходзяцца па сваіх месцах. Дзень практычнай вучобы пачаўся.

У полі кожнай брыгадзе выдзелены ўчастак, дзе студэнты практычна замацоўваюць набытыя ва універсітэце веды.

Геадэзісты прыступілі да праверкі прылад. Яны вядуць здымкі ўчастка мясцовасці і па атрыманых даных вычэрчваюць план участка.

Метэаролагі выбіраюць характэрныя пункты мясцовасці. Ім прадстаіць вызначыць тэмпературу паветра і глебы, вільготнасць паветра, скорасць ветру, пабудаваць карту размеркавання і графік ходу гэтых метэаралагічных элементаў, выявіць заканамернасці размеркавання метэаралагічных элементаў у залежнасці ад падсцілаючай паверхні.

Геамарфолагі ўдакладняюць напрамак геамарфалагічных профіляў. Профіль пачынаецца ад ракі і праходзіць праз забалочаны ўчастак і густы кустарнік. Але нічога не зробіш, давозіцца пераадольваць і гэтыя перашкоды. Потым гэты профіль будзе нанесены на міліметровую паперу і прыкладзены да справаздачы.

Глебазнаўцы ўзялі сваё галоўнае «ўзбраенне» — лапаты і ідуць высвятляць напрамак геалагічнага профілю. Не адзін кубічны метр зямлі прыйдзецца ім падняць «на-гара», таму што для вызначэння глебы неабходна выкапаць шурф глыбінёй два метры, і такіх шурфаў патрэбна некалькі. Потым вызначыць назву і састаў глебы, гарызонт залягання ў кожным шурфе і запісаць усё гэта ў дзённік, пасля чаго пабудаваць глебавы профіль.

Наш «фотакарэспандэнт» Саша Якаўлеў спяшаецца ўсё зазняць на плёнку, каб паспець заўтра павесіць першую фотагазету.

Пасля абеду брыгады зноў у полі. Вучоба. Работа. І толькі ўвечары ўсе збіраюцца на станцыі, ля кастра, дзеляцца ўражаннямі. Пасля вячэры на лугу гучаць песні, пачынаюцца танцы, гульні.

Дзень практычнай вучобы закончаны. Што ён даў? Напрыклад, Мікалай Конанаў і Ніна Краўчынская навучыліся працаваць з тэадалітам і нівеліpам. Валя Зімянкова — вызначаць тэмпературу паветра, а Мікалай Жалняровіч і Оля Малчанава — капаць шурфы і пераадольваць забалочаныя ўчасткі. Многа даў рабятам гэты дзень, асабліва калі ўлічыць, што студэнт-завочнік з шасці гадоў навучання знаходзіцца ў сценах роднага універсітэта менш года.

*А. КУКСАЧОЎ,*
*А. ЛІХАЧОЎ.*





**Курс «Савецкае дзяржаўнае права» студэнты II курса завочнага факультэта аддзялення правазнаўства здаюць прафесару юрфака С. Р. Віхараву.**

Фота Т. Петрашкевіч.

## ДАБРАТУ І ЛЮБОЎ — ВУЧНЯМ!

Для маладой настаўніцы 116-й школы г. Мінска Тамары Ёрш таксама, як і для іншых студэнтаў-завочнікаў VI курса, гэта сесія асабліва хвалюючая. І не толькі таму, што яна апошняя ў іх студэнцкім жыцці. Гэта сесія з'яўляецца генеральнай рэпетыцыяй перад здачай дзяржаўных экзаменаў і абаронай дыпломных работ.

Не адразу зразумела Тамара, што прафесія настаўніцы стане яе любімай справай на ўсё жыццё. Спачатку было медвучылішча, потым — два гады работы па спецыяльнасці. Але гэта работа не зусім задавальняла дзяўчыну. Яшчэ ў школе яна пачала пісаць вершы, супрацоўнічала ў літаратурным аб'яднанні слонімскай газеты «За перамогу камунізму». Потым паявілася жаданне паступіць на філалагічны факультэт. Яна стала студэнткай. Першай прыступкай да будучай дзейнасці стала для Тамары работа вызваленым сакратаром камсамольскай арганізацыі медвучылішча. За два гады работы яна зразумела, што пастаянныя зносіны з людзьмі — гэта яе прызванне. Пасля некалькіх гадоў вучобы на завочным факультэце універсітэта яна змагла працаваць настаўніцай у школе. Тамара пачала выкладаць рускую мову і літаратуру ў Слонімскай раённай школе. Дырэкцыя школы заўважыла здольнасці маладой выкладчыцы і даверыла ёй кіраўніцтва класам. Разам са сваімі рабятамі Тамара дапамагала калгасу ў перыяд веснавой сяўбы і восеньскай уборкі ўраджаю. І ў гэты час яна зразумела, якое вялікае значэнне мае пазакласная работа, як яна згуртоўвае рабят. Гэта вельмі дапамагае настаўніцы і ў цяперашняй яе рабоце.

116-я школа — паказальная. Тут на высокім узроўні вядзецца не толькі вучэбная, але і грамадская работа. І Тамара, нягледзячы на тое, што яна дыпломніца, актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю — кіруе драматычным гуртком. І як да ўсяго іншага, да гэтых абавязкаў Тамара адносіцца вельмі добрасумленна. Яна поўнасцю абнавіла рэпертуар гуртка.

Самае галоўнае, у чым Тамара бачыць высокае прызначэнне настаўніцы— гэта прывіць сваім вучням любоў да роднай беларускай мовы, якую яна цяпер выкладае.

Тамара працуе з поўнай аддачай сіл, і лепшай ацэнкай яе працы з'яўляюцца выдатныя поспехі ў вучобе яе рабят. Вучні шчодра плацяць настаўніцы за любоў і дабрату.

Адказы на шматлікія пытанні, якія яе хвалююць, знайшла Тамара ў творах таленавітага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Таму і дыпломная работа будзе прысвечана яго творчасці.

За шэсць гадоў вучобы ва універсітэце ў залікоўцы Тамары паявіліся толькі тры «чацвёркі», астатнія прадметы яна здала на «выдатна». Пажадаем жа маладой настаўніцы новых поспехаў у вучобе і ў яе цяжкай, але высакароднай працы.

**Л. ШВАНЁВА.**

# ТАБЕ—ЗАВОЧНІК!

## ДЗЯКУЙ ТАБЕ, ГЕАФАК!

НАСТУПАЕ дзень, якога мы так доўга чакалі, але разам з тым надыход якога навявае нейкі сум. Шэсць гадоў назад мы, студэнты-завочнікі геаграфічнага факультэта БДУ, прыехалі на сваю першую сесію, і вось цяпер наступіў час, калі мы павінны расстацца з любімымі выкладчыкамі, з сябрамі па вучобе, з нашым факультэтам.

Шэсць гадоў назад мы сабраліся сюды з усіх куткоў нашай Радзімы. Людзі розных узростаў, розных прафесій выбралі іменна геаграфію—навуку вельмі цікавую і перспектыўную. Вучыцца было нялёгка, і кожны з нас ведаў, якія цяжкасці могуць напаткаць чалавека, які і вучыцца, і працуе, і мае сям'ю. Вялікую дапамогу аказвалі нам выкладчыкі факультэта прафесар В. Ф. Якушка, дэкан завочнага факультэта Н. С. Мажэйка, намеснік дэкана У. У. Стэцко, прафесары В. Р. Заўрыеў, М. Т. Рамаyоўскі, метадыстка Г. А. Дунаева і многія іншыя. Тэарэтычнае вывучэнне дысцыплін праходзіла ў цеснай сувязі з практычнымі заняткамі. Мы працавалі з рознымі прыладамі, якія прымяняюцца ў метэаралогіі, астраноміі, геадэзіі ў палявых умовах у час практыкі. Назаўсёды застануцца ўспаміны аб цудоўным кутку — геабазе «Заходняя Беразіна», дзе мы не толькі займаліся вучобай, а і працавалі на ўпарадкаванні гарадка. Колькі яшчэ разоў мы ўспомнім тыя вясёлыя вечары каля кастра, нестарэючыя студэнцкія песні пад гітару! У сумеснай вучобе і працы з'яднаўся калектыў. Заўсёды можна было звярнуцца за дапамогай і парадай да стараст груп В. Прышчэпінай, В. Пятровіч, П. Валашчук, дапамагалі разабрацца ў незразумелых пытаннях нашы выдатнікі Э. Вашкевіч, Т. Ганчарук, І. Рубан і іншыя.

Калі мы толькі паступалі, нам здавалася, што шэсць гадоў — гэта вельмі доўга. А зараз, калі амаль усё ззаду—расчараванні (было і такое), радасці, цяжкасці,—адчуваеш, як хутка яны праляцелі. Нялёгка спалучаць работу і вучобу, але тым прыемней усведамляць, што атрыманыя веды патрэбны людзям, грамадству.

Напярэдадні апошняга званка мы, выпускнікі завочнага факультэта аддзялення геаграфіі, гаворым словы ўдзячнасці людзям, якія адкрылі нам дарогу ў вялікую геаграфію, падзяліліся сваім вопытам, далі нам веды. Дні вучобы незабыўныя і застануцца ў памяці назаўсёды.

**А. БЫР,**
**Н. ВАРАПАЙ,**
**М. ЛУКАШЭВІЧ,**
**студэнты VI курса завочнага факультэта аддзялення геаграфіі.**

## ПЕРАД ГАЛОЎНЫМ ЭКЗАМЕНАМ

Непрыкметна праляцелі шэсць гадоў нашай вучобы ў БДУ, і вось наступіла апошняя экзаменацыйная сесія.

Шэсць гадоў... Аглядваючыся назад, з пачуццём задавальнення адзначаеш шлях, які ты прайшоў да ведаў, шлях, поўны напружанай працы, хваляванняў, радасцей і засмучэнняў, поспехаў і няўдач. І чым цяжэй быў гэты шлях, тым прыемней усведамляць сябе студэнтам апошняга курса. Тым больш, калі належыш да асобай катэгорыі студэнтаў — завочнікаў. Вядома, што завочнае навучанне прадстаўляе сабой больш складаную і цяжкую форму навучання ў параўнанні з іншымі. Галоўная цяжкасць заключаецца ў тым, што паміж табой і падручнікам практычна няма пасрэдніка ў асобе выкладчыка. Тыя асноўныя напрамкі, якія дае выкладчык на лекцыі ў час сесіі, па зразумелых прычынах недастатковыя, каб выканаць патрабаванні вучэбных праграм. Але калі студэнт пастаянна займаецца самастойна, завочнае навучанне з'яўляецца таксама эфектыўным. Такім чынам, асноўныя ўмовы паспяховай вучобы завочнікаў — добрасумленнасць і працавітасць. На жаль, ёсць яшчэ студэнты, якія бачаць сваю галоўную мэту ў тым, каб «спіхнуць» выкладчыку кантрольную або курсавую работу, залік або экзамен. Такі падыход да вучобы дае вельмі нязначныя вынікі.

Кантрольную або курсавую работу, залік або экзамен трэба ў першую чаргу здаваць для таго, каб пабольш даведацца і запомніць. І яшчэ адна абавязковая ўмова, неабходная студэнту-завочніку: трэба раўнамерна і сістэматычна займацца ў міжсесійны перыяд. Па сабе ведаю: упусціш штонебудзь, не давучыш, і тады вельмі цяжка ў перыяд сесіі, калі даводзіцца здаваць залікі і экзамены, навёрстваць упушчанае. У такім выпадку аб трываласці ведаў гаварыць ужо не даводзіцца. У гэтай сувязі неабходна адзначыць вялікую перавагу, якую дае завочніку датэрміновая здача экзамена або заліку.

Што дало нам шасцігадовае навучанне на завочным факультэце? Адкажу так: той з нас, хто прыйшоў ва універсітэт за ведамі, іх атрымаў. Больш таго, завочнае навучанне дало нам, на мой погляд, пэўныя перавагі перад стацыянарным. Папершае, мы навучыліся самастойна працаваць з вучэбнай літаратурай. Падругое, навучыліся рацыянальна планаваць свой час. Па-трэцяе, навучыліся цаніць кожнае слова выкладчыка ў час лекцыі, бо жывое слова нельга замяніць ніякімі падручнікамі. Надоўга застанецца ў нашай памяці бліскучыя лекцыі прафесара Л. С. Абецэдарскага, дацэнтаў Л. Л. Кароткай, Д. П. Багровай, А. С. Малініна, М. А. Пауленкі і іншых. Запомніцца нам і тая добразычлівасць, з якой адносіліся да нас супрацоўнікі дэканата завочнага факультэта і метадысты. Вялікае ім усім дзякуй за дапамогу і падтрымку!

Мы здалі ўсе экзамены і залікі апошняй экзаменацыйнай сесіі, але наперадзе ў нас галоўны экзамен — абарона дыпломных работ. Хочацца верыць, што і гэты апошні экзамен будзе паспяхова здадзены.

**А. ЦЕРАХАЎ,**
**студэнт VI курса завочнага факультэта аддзялення рускай мовы і літаратуры.**

## ГЭТЫ АПОШНІ, АПОШНІ КУРС...

*На пытанні нашай анкеты адказваюць студэнты VI курса завочнага факультэта аддзялення філасофіі.*

**1. ШТО ЗАПОМНІЛАСЯ ЗА ГАДЫ ВУЧОБЫ БОЛЬШ ЗА УСЁ? 2. ЯКІЯ ЦЯЖКАСЦІ ДАВЯЛОСЯ ПЕРААДОЛЕЦЬ? 3. РАСКАЖЫЦЕ ПРА ДЫПЛОМНУЮ РАБОТУ. 4. ШТО Б ВЫ ПАЖАДАЛІ БРАТАМ-МАЛОДШАКУРСНІКАМ?**



**АЛЯКСАНДР ДАРОНІН,** сакратар камсамольскай арганізацыі ГПТВ-85 металістаў г. Барысава:

1. На першым курсе — тады я, праўда, вучыўся на стацыянары — лекцыі па ўводзінах у філасофію чытаў член-карэспандэнт АН БССР В. І. Сцяпанаў. Прайшло шмат часу, але, як сёння, чую яго голас. Тыя лекцыі можна было не запісваць. Яны запомніліся на ўсё жыццё.

2. Цяжка адказаць на гэта пытанне. Усе шэсць год вучобы прайшлі роўна і гладка, без «хвастоў» і незвычайных здарэнняў. І першая цяжкасць натрапіла іменна сёння, калі мы здаём «Сучасную буржуазную філасофію» выкладчыку Г. Грушавому. Складаны экзамен...

3. Мая дыпломная—лагічны вынік курсавых работ. Дарэчы, гэта вам скажуць наконт сваіх дыпломных многія аднакурснікі. «Дыялектыка катэгорыі «сутнасць» у філасофіі Арыстоцеля» — тэма, не распрацаваная ў філасофіі. Давядзецца быць поўнасцю самастойным. І, канешне, разлічваю на дапамогу кіраўніка М. І. Іоські, дацэнта кафедры гісторыі філасофіі і логікі.

4. Хай запомняць: цікавей за ўсё здаваць першы і апошні экзамен.



**АЛЯКСАНДР БАРОДЗІЧ,** старшы майстар Гродзенскага дрэваапрацоўчага аб'яднання, выдатнік, кандыдат на «чырвоны дыплом»:

1. Калі прааналізаваць шэсць год вучобы, можна вылучыць нешта агульнае: сістэматызаваліся веды аб навакольным свеце, мы ўзбагаціліся духоўна. Універсітэт дае шмат для развіцця чалавека як асобы.

Канкрэтна? Я лічу, што многае далі лекцыі па агульнай псіхалогіі, якія на першым курсе чытаў кандыдат навук Р. Вадэйка. Першае далучэнне да філасофіі завязана з фармальнай логікай, якую на I—II курсах выкладаў В. Бартан. Урэшце, першыя курсы заўсёды поўныя багатых уражанняў...

2. Я многа займаюся — кожны дзень. Пастаянная падрыхтоўка зводзіць да мінімуму нечаканасці ці непрыемнасці ў час сесіі. Гэтага патрабуе сама філасофія — навука няпростая, з вялікім аб'ёмам ведаў. Яна і ёсць асноўная цяжкасць.

3. Вельмі прыцягвае светапоглядны бок філасофіі, тое, што навука можа даць адказы на шматлікія пытанні нашага жыцця. Таму і тэму дыпломнай я выбраў такую, каб вывучыць праблемы матэрыі, паказаць розныя яе аспекты. Завецца яна так: «Дыялектычны матэрыялізм аб невычэрпнасці матэрыі і яе атрыбутаў».

4. Як мага больш працаваць над самім сабой.



**ГАЛІНА СЦЕПАНЕНКА,** настаўніца пачатковых класаў СШ № 1 г. Мінска:

1. Чатыры гады я вучылася на вячэрнім аддзяленні, а затым сямейныя абставіны прымусілі мяне перавесціся на завочны факультэт. Увогуле, не шкадую. Група даволі дружная. Так што на першае пытанне можна даць такі адказ — запомніліся людзі, мае таварышы па вучобе.

2. Першыя цяжкасці былі звязаны з тым, што аддзяленне мае матэматычны ўхіл. Спалучэнне прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін. Фізіка, матэматыка — гэта і былі тыя цяжкасці, якія нам давялося перамагчы. Зараз новае выпрабаванне — сесія. За дваццаць дзён мы павінны здаць пяць экзаменаў і адзін залік. Лёгка?

3. Аб дыпломнай хацелася б расказаць падрабязней. «Філасофскія праблемы псіхалогіі». Зацікаўленасць псіхалогіяй у мяне яшчэ са школы. Скончыла з адзнакай Мінскае педвучылішча, паступіла ў педінстытут. Але хутка пакінула яго: характар выкладаемых дысцыплін не адпавядаў маім запатрабаванням. Працуючы настаўніцай, я працягвала займацца псіхалогіяй школьнікаў. Потым — вучоба ў БДУ. Канешне, калі б ва універсітэце існаваў факультэт псіхалогіі, як у МДУ або ЛДУ, я паступала б на яго. Але лічу, што аддзяленне філасофіі мне многае дало ў галіне любімай навукі. Хочацца напісаць дыпломную работу як грунтоўнае, сур'ёзнае даследаванне. І тое, што псіхалогіяй я займаюся каля дзесяці год, мне вельмі дапаможа.

4. Па магчымасці заглядвайце ў падручнік не толькі ў час сесіі, але і на працягу семестра. Вам яшчэ пераадольваць безліч экзаменаў і залікаў, а штурмаўшчына нічога, акрамя сапсаванага здароўя, не дасць. А ў астатнім — ні пуху, ні пер'я!

**Анкету правяла**
**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

### ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК



— Каму ж гэта са студэнтаў я так моцна пацісну́ў руку!




Без слоў.

### З АДКАЗАЎ АБІТУРЫЕНТАЎ НА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАХ

Пугачоў дорыць Грынёву сваё жыццё.

«Вайна і мір»—былы твор Талстога.

Пячорын бязропатна пакараў сэрцы жанчын.

Таццяна пакахала Анегіна, але ён не выкарыстаў гэтыя абставіны.

Нілаўна павінна была карміць звера.

Няня—сямейны ачаг цяжкага мінулага.

А якая прыгожая вёска раніцою, калі пачынаюць сваю пераклічку каровы, якія ідуць у поле!

Папаўшы ў Маскву, Герасіма назначылі глуханямым дворнікам.

Гераіня захапілася спевамі і дрэнным жыццём.

Атам састаіць з пратонаў, электронаў і ньютонаў.

# ЛЮТАЎСКІ КАЛЯНДАР

**3** — 10 гадоў назад (1966) савецкая аўтаматычная станцыя «Месяц-9», якая была запушчана 31 студзеня, здзейсніла першую пасадку на паверхню Месяца і перадала тэлевізійнае адлюстраванне месяцавай паверхні.

**5** — 125 гадоў з дня нараджэння І. Д. Сыціна (1851—1934), рускага кнігавыдаўцы-асветніка.

**15** — 70 гадоў з дня нараджэння Мусы Джаліля (1906—1944), татарскага савецкага паэта, Героя Савецкага Саюза.

**17**—70 гадоў з дня нараджэння А. Л. Барто (1906), савецкай паэтэсы.

**20** — 90 гадоў з дня нараджэння Бела Куна (1886—1938), дзеяча венгерскага і міжнароднага камуністычнага і рабочага руху.

**21** — 100 гадоў з дня нараджэння П. П. Канчалоўскага (1876—1956), савецкага жывапісца.

**23 — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ.**

**25** — 55 гадоў з дня ўстанаўлення (1921) Савецкай улады ў Грузіі.

**26** — 80 гадоў з дня нараджэння А. А. Жданава (1896—1948), дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы.



# ІДУЦЬ СПАБОРНІЦТВЫ

Сесія — гарачая пара як для студэнтаў, так і для супрацоўнікаў. Але ў спартыўнай зале БДУ і ў гэты час працягваюць няспынна гучаць галасы, судзейскія свісткі — ідуць спаборніцтвы.

У перыяд сесіі ва універсітэце праводзіцца спартакіяда супрацоўнікаў БДУ «Здароўе». У праграму спаборніцтваў уваходзяць наступныя віды: валейбол, баскетбол, шахматы, шашкі, стральба і лыжы. Ужо падведзены вынікі спаборніцтваў па баскетболу і валейболу.

У барацьбе за права быць першымі прынялі ўдзел 13 баскетбольных каманд: 9 мужчынскіх і 4 жаночыя. Пасля напружанай і захапляючай гульні баскетбалістаў месцы размеркаваліся наступным чынам: сярод жаночых каманд першае месца заваявала каманда кафедры фізвыхавання, другое — каманда фізічнага факультэта і трэцяе — каманда ФПМ.

Сярод мужчынскіх каманд першае месца засталося зноў за кафедрай фізвыхавання, другое заняла каманда фізфака і трэцяе — каманда НДІ ПФП.

Каманды-пераможцы былі ўзнагароджаны пераходнымі кубкамі і граматамі мясцкома, якія ўручыў старшыня мясцкома БДУ І. Г. Родзін.

## СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# НАРОЎНІ З ЧАСАМ

У мінулым годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла новая кніга І. Мележа «Жыццёвыя клопаты». У ёй змешчаны артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. Але ўся кніжка мае адзіны напрамак, стрыжань. Як адзначае ў прадмове сам аўтар, сабраныя разам творы па сутнасці становяцца своеасаблівым дзённікам, справаздачай пісьменніка перад чытачом.

Яшчэ не прачытаўшы ніводнай старонкі, мы здагадваемся, аб чым павядзе размову аўтар. Да гэтай думкі нас падводзіць сама назва кнігі — «Жыццёвыя клопаты». І калі чытаеш твор, то ўсё больш адчуваеш, якая вялікая цікавасць пісьменніка да розных праяў жыцця.

Кніга — частка самога пісьменніка, гэта яго змаганне з жыццём за жыццё і ў імя жыцця. Няма падзеі, якая б нейкім чынам не стала часцінкай самога Івана Мележа, пісьменніка і грамадзяніна.

Шмат увагі ўдзяляе Мележ сённяшняй літаратуры. Ён ставіцца з высокімі патрабаваннямі да сябе і да ўсіх беларускіх пісьменнікаў. Мележ клапоціцца, каб літаратура адпавядала сучасным патрабаванням. Каб быць вялікай, наша літаратура не павінна шукаць лёгкіх шляхоў, піша Мележ. «Ісці дарогамі жыцця, служыць народу, працаваць з народам — у гэтым, па-мойму, аснова велічы нашай літаратуры, сэнс яе жыцця. Толькі ў гэтым. І сёння, і заўтра. І — заўсёды». Але гэтага недастаткова, тут яшчэ добра і яшчэ як добра трэба ведаць гісторыю свайго народа. І чэрпаць з мінулага ўсё добрае, пераасэнсоўваць здабыткі і рабіць належныя вывады. У сваім творы ён і звяртаецца да разгляду творчасці вялікіх беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага і іншых. Можна вылучыць як бы невялікі раздзел, дзе аўтар гаворыць аб творчасці замежных пісьменнікаў. Гэта артыкулы пра Анры Барбюса, Рамэна Ралана, Стэндаля. Мележа цікавіць не толькі літаратурная творчасць, але і іх погляды, усё тое, што адбываецца ў жыцці, што так непакоіць самога пісьменніка. «Жыццё Рамэна Ралана — гэта жыццё чалавека, які жыў радасцямі і трывогамі свайго народа, жыццём усяго свету. Пра яго, як мала пра каго, з поўным правам можна сказаць — гэта быў у самым высокім значэнні — сын народа, «грамадзянін свету».

Рысы мужных байцоў у вобразах гэтых пісьменнікаў Мележ падкрэслівае таму, што і яго вельмі хвалюе тэма вайны і міру. У свеце сёння яшчэ далёка не спакойна. Пісьменнік заклікае людзей зразумець трагедыю беларускай вёскі і запомніць назаўсёды, што Хатынь—толькі адна з многіх. «Пастарайцеся ўявіць неймаверныя маштабы таго, што перажылі ў вайну ўсе нашы беларускія вёскі і гарады іншых рэспублік Савецкай краіны, якія аказаліся пад фашысцкай акупацыяй».

Мележ разумее, што пагроза вайны яшчэ існуе, і лічыць сваім вялікім грамадзянскім абавязкам весці барацьбу супраць гэтага злачынства. У артыкуле «Мы разумеем ваша гора» ён звяртаецца да грэчаскіх эмігрантаў, гаворыць, што гора грэчаскага народа блізка і нам.

Вось толькі некалькі праблем, якія ўзняты пісьменнікам у творы. Наогул жа іх шмат, і вырашаны яны вельмі цікава. За кожнай з іх стаіць жыццё з яго клопатамі, справамі, падзеямі.

Што ж датычыць мастацкіх асаблівасцей, то артыкулы Мележа характарызуе сцісласць, дынамічнасць. Ён як бы канстатуе факты адзін за другім, у храналагічным парадку, у тым парадку, па якім ідзе жыццё.

Усебаковы ахоп жыццёвых праблем, жаданне закрануць клопаты савецкага чалавека, патрабаванне паспець за ходам часу і вызначае публіцыстычнасць твора.

**К. ПОБАЛЬ.**

# ВАМ, ПЕШАХОДЫ...

*У нашым лексіконе ўсё часцей сустракаюцца словы «дарожныя здарэнні». Наўрад ці сустрэнеце вы вадзіцеля, які жадае стварыць аварыйную абстаноўку на дарозе, ці пешахода, які пажадаў бы стаць калекай. А між тым падобныя трагедыі ў нашым жыцці здараюцца. І пачынаюцца яны з сустрэчы з аўтамабілем.*

*Вядома, аварый без прычын не бывае. І ў ролі парушальнікаў выступаюць як вадзіцелі транспартных сродкаў, так і пешаходы. Але пешаход — найбольш небяспечны ўдзельнік руху. Ён, як правіла, больш спадзяецца на вадзіцеля, чым вадзіцель на яго. Іншыя мяркуюць, што ведаць правілы дарожнага руху зусім не абавязкова. Часам цяжка растлумачыць паводзіны чалавека, які наведвае паліклініку, пастаянна клапоціцца аб сваім здароўі і разам з тым рызыкуе загубіць жыццё, перабягаючы вуліцу перад ідучым транспартам.*

*Паназірайце за рухам. Горад жыве ў сваім, строга размеркаваным рытме. Але вось гэты рытм парушаецца, запавольваецца рух, машыны згрудзіліся і насунуліся адна на адну. Што здарылася? А гэта нейкі грамадзянін задумліва ідзе на чырвоны сігнал светафора.*

*Пешаход заўсёды павінен быць уважлівым на вуліцы, асабліва зараз, калі слізка і мокра. У гэты перыяд тармазны шлях аўтамабіля павялічваецца ў тры-чатыры разы, і часам пры раптоўным паяўленні пешахода на праезджай частцы вадзіцель не мае тэхнічнай магчымасці папярэдзіць наезд. Так, на Партызанскім праспекце аўтамабілем ГАЗ-24 1 студзеня быў зроблен наезд на рабочага аўтазавода А. Ламцэвіча, які раптоўна выбег на вуліцу. У выніку дарожнага здарэння пешаход атрымаў цялесныя пакалечанні і быў дастаўлен у бальніцу.*

*Усяго за 10 дзён 1976 года ў горадзе адбылося 13 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх у асноўным былі вінаваты пешаходы.*

*Хочацца яшчэ раз звярнуцца да вас, таварышы пешаходы: будзьце ўважлівымі на вуліцы!*

**Г. СТРАЛЬЧОНАК,**
**супрацоўнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

# ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ



26 студзеня 1950 года над Індыяй упершыню быў падняты трохкаляровы сцяг Рэспублікі. З таго часу гэты дзень адзначаецца па ўсёй краіне як вялікае нацыянальнае свята.



НА ЗДЫМКАХ: архітэктурныя помнікі Хайдзерабадскі Чар-Мінар (XV ст.) і Фатэхпур-Сікры — «Мёртвы горад» (1569 г.).

**Фота У. БУДАЯ.**

## ТВОЙ ЭТЫКЕТ

# ШТО ТАКОЕ ВЫХАВАНАСЦЬ?

Кожнага чалавека можна ацэньваць з розных пунктаў гледжання. І па «вопратцы», і па розуму. І як работніка, і як спадарожніка, і як спецыяліста, і як субяседніка. І ў якасці таварыша, і ў ролі сем'яніна. Крытэрыі розныя, і адносіны да аднаго і таго ж чалавека таксама могуць быць рознымі. Ёсць, аднак, сістэма ацэнак, якія падыходзяць ва ўсіх выпадках. «Выхаваны чалавек»,—гавораць аб тым ці іншым знаёмым, падразумяваючы пры гэтым, што выхаванасць іменна тая якасць, якая ўпрыгожвае яго і як спецыяліста, і як добрага знаёмага, і як сябра.

Ва ўсе часы выхаванасць ацэньвалася вельмі высока. Іменна яе мелі на ўвазе, калі гаварылі аб рыцарстве, пачцівасці, ветлівасці і далікатнасці. Пры гэтым, усякі раз размова ішла не толькі аб комплексе добрых манер і звычак, але і аб вядомым складзе душы, аб вядомым характары і маральных поглядах. Выхаваны чалавек—гэта іменна той, у каго зграбнасць і ветлівасць служаць звыклым знешнім праяўленнем, унутранай гармоніяй і душэўным высакароддзем.

Вельмі добра пра выхаванага чалавека сказаў акадэмік І. Кнунянц. Ён адзначыў, што выхаваны чалавек—гэта чалавек думаючы. Дакладней, які выхаваў у сабе культуру мыслення. Размова з такім чалавекам заўсёды цікавая, дае нам нешта новае. І ў той жа час гэты чалавек заўсёды просты. Выхаваны чалавек не арыгінальнічае. Ён не стараецца паказаць сваю перавагу над іншым. Навошта яму гэта? Паказаць сваю перавагу заўсёды стараецца якраз той, у каго нічога няма за душой, хто не можа па-сапраўднаму праявіць сябе.

*У СУВЯЗІ З ЗІМОВЫМІ КАНІКУЛАМІ НАСТУПНЫ НУМАР ГАЗЕТЫ ВЫЙДЗЕ 12 ЛЮТАГА 1976 ГОДА.*

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 04040 Заказ № 163.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.